


*Да арт.* ***Шаркаўшчына****. Будынак цэнтральнай раённай бальніцы.*

мы КП(б)Б (11.9.1943—2.7.1944) і ЛКСМБ (14.9.1943—2.7.1944), партыз. брыгады імя Суворава, імя Леніна, «Спартак», «Кастрычнік», «За Радзіму», 4-я Бел. імя Гастэлы, 16-я Смаленская і інш. партыз. фарміраванні. Выдавалася падп. газ. «Народный мститель». Раён вызвалены ў канцы чэрв.—пач. ліп. 1944 у ходзе Полацкай аперацыі войскамі 1-га Прыбалтыйскага фронту. З 20.9.1944 у Полацкай, з 8.1.1954 у Маладзечанскай, з 20.1.1960 у Віцебскай абласцях. 17.4.1962 раён скасаваны, г.п. Шаркаўшчына і 7 сельсаветаў перададзены Мёрскаму, 2 сельсаветы — Браслаўскаму р-нам. 30.7.1966 Ш.р. утвораны зноў у складзе 9 сельсаветаў. У 2000 у раёне 8 сельсаветаў, 272 сельскія нас. пункты.

Дзейнічаюць прадпрыемствы сельскай гаспадаркі, харчовай прамсці і інш. У раёне (2015) 5 сярэдніх, 10 базавых школ, 6 вучэбна-пед. комплексаў дзіцячы сад — школа (у т.л. 2 на аснове сярэдняй, 4 — пачатковай школы), 2 школы мастацтваў, ДЮСШ, 10 дашкольных устаноў, цэнтры: дзяцей і моладзі, сац.-пед., карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі. Працуюць раённыя Цэнтр культуры і Цэнтр рамёстваў, 11 сельскіх Дамоў культуры, Цэнтр культуры і нар. традыцый і Дом ганчара (в. Германавічы), Цэнтр культуры і адпачынку (в. Верацеі), Дом нар. творчасці (в. Буеўшчына), Дом фальклору (в. Каўшэлева), 4 сельскія клубы, аўтаклуб, раённая, дзіцячая і 19 сельскіх б-к, музей культуры і побыту (в. Германавічы, з філіялам у в. Лужкі), музей садавода-селекцыянера І.П.Сікоры ў б. в. Малыя Алашкі. У сістэме аховы здароўя раёна 3 бальніцы, паліклініка, 2 амбулаторыі ўрача агульнай практыкі, 18 ФАПаў. Выдаецца раённая газ. «Кліч Радзімы». У раёне 17 рэліг. абшчын, у т.л. 8 праваслаўных, 4 каталіцкія, 3 стараабрадніцкія, 1 евангельскіх хрысціян-баптыстаў, 1 хрысціян веры евангельскай. Помнік археалогіі: гарадзішча ў в. Гарадзец. Помнікі архітэктуры і садова-паркавага мастацтва: Праабражэнскі касцёл (1787), сядзібна-паркавы комплекс (канец 18 — 19 ст.), Успенская стараабрадніцкая царква (1900) у в. Германавічы, Міхайлаўскі касцёл (1744—56), царква Раства Багародзіцы (1794) і вадзяны млын (19—пач. 20 ст.) у в. Лужкі, сядзібна-паркавы комплекс і капліца (канец 18 ст.) у в. Гарадзец, Ільінская царква (1825) у в. Шкунцікі, Успенская царква (1914) у в. Варонка. Помнікі гісторыі: брацкая магіла сав. воінаў у в. Лужкі, брацкая магіла сав. воінаў і мірных жыхароў у в. Лонскія, магіла сав. ваеннапалонных у в. Гарадзец. Помнікі землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, у в. Амбросенкі, Белы Двор, Більдзюгі, Боўкалы, Верацеі 1, Вял. Сяло, Гарадзец, Германавічы, Грыгараўшчына, Дворнава, Дзіўная, Жукоўшчына, Запруддзе, Зорка, Каўшэлева, Корніца, Мішуты, Наваселле, Пялікі, Радзюкі, Сасноўцы, Сталіца, Станіслававa, Юзафова. У б. в. Малыя Алашкі нарадзіўся бел. селекцыянер-аматар І.П.Сікора (1885—1966), на б. хутары Падсосна — бел. пісьменнік М.Машара (1902—76), у б.в. Гарбуны — нар. артыст Беларусі П.П.Дубашынскі (1931—2000).

**ШАСТА́К**, 1) беларуская і ўкраінская назва манеты наміналам у 6 грошаў у 16—18 ст. 2) Рас. білонная манета, якая прызначалася для забеспячэння плацежаздольнасці арміі Пятра І на тэр. Беларусі, Украіны і Польшчы ў час Паўн. вайны 1700—21. Эталонам для чаканкі была манета Рэчы Паспалітай у 6 грошаў. Афіцыйна ўстаноўленыя проба і лігатурная маса пры выпуску былі паменшаны. Рыначны курс абарачэння — 4 капейкі. Ш. выпускалі Кадашаўскі і Красны манетныя двары ў 1707 і, магчыма, у 1708 штэмпелямі 1707.

**ШАЎРА** Рыгор Фёдаравіч (н. 30.8.1944, в. Малы Поўсвіж Лепельскага р-на), беларускі мастацтвазнавец, мастак. Д-р мастацтвазнаўства (2009), праф. (1997). Скончыў Віцебскі пед. ін-т (1971). З 1977 выкладае ў Беларускім ун-це культуры і мастацтваў (з 1993 заг. кафедры). Даследуе праблемы развіцця бел. прафес., нар. і аматарскага мастацтва, творчасць



*Р.Шаура. Гурзуф у кастрычніку. 2001.*

сучасных бел. мастакоў («Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі: Жывапіс, графіка, скульптура», 1995, і інш.). Працуе ў акварэлі: пейзажы «Над возерам Лепельскім» (1977), «Над ракой Улай» (1997), «Настальгія», «Вячэрняя рапсодыя» (абедзве 1998), «Кастрычніцкі мажор» (2000), «Лагойшчына зімой» (2002), «Гурзуф у кастрычніку» (2003), «Вечар на Заходняй Дзвіне» (2005) , «На лепельскіх азёрах» (2007), «Туманная раніца» (2013), «Дарога на Вязынку» (2015); нацюрморты: «Нацюрморт з гладыёлусамі» (1978), «Нацюрморт з сухіх кветак» (1982) і інш. Прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» 2000. Дзярж. прэмія Беларусі 2003.

*Тв.*: Пейзаж у беларускім жывапісе. Мінск, 1980; Беларускі пейзажны жывапіс. Мінск, 1982; Перспектыва ў малюнку і жывапісе. Мінск, 1999; Малюнак у навучальным працэсе. Мінск, 2003; Развіццё народнага выяўленчага і дэкаратыўнага мастацтва Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XXI ст. Мінск, 2006.

*Г.А.Фатыхава.*

**ШАЎРÓВА С.С. МУЗÉЙ ДРАЎЛЯ́НАЙ СКУЛЬПТЎРЫ**, філіял Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны. Засн. ў 1992 у г. Орша ў доме самадзейнага разьбяра па дрэве, нар. майстра Беларусі С.С.Шаўрова (1916—2000). Агульная пл. экспазіцыі 35,3 м². Спачатку калекцыя музея налічвала 19 скульптур майстра, цяпер экспануюцца 50 скульптур, усяго ў фондах музея больш за 270 работ. У асн. экспазіцыйнай зале — б. майстэрні С.Шаўрова — прадстаўлены асабістыя рэчы, фотаздымкі, дакументы, узнагароды, рабочыя інструменты. Скульпт. кампазіцыям майстра ўласцівы дасціпнасць, гумар, часам гратэск. Часта гэта партрэты родзічаў, аднавяскоўцаў, жанравыя сцэнкі. У работах увасоблены фалькл., літ., казачныя, анімалістычныя матывы, гераічнае мінулае краіны, нар. побыт і інш. Пры музеі ў асобным будынку працуе майстэрня драўлянай скульптуры, праводзяцца заняткі гуртка «Юны разьбяр». Каля музея пад адкрытым небам створана «Казачная паляна», аздобленая творамі сучасных майстроў разьбы па дрэве, дзе арганізуюцца святочныя мерапрыемствы, канцэрты, маст. пленэры. У музеі праводзяцца выстаўкі прафес. і аматарскай драўлянай скульптуры.



*В.Ф.Шкаруба.*

**ШКАРЎБА** Валерый Фёдаравіч (н. 10.12.1957, г. Барысаў), беларускі жывапісец. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (2014). Скончыў Бел. тэатр.-



*В.Шкаруба. Восеньскае святло. 2002.*